УДК 94: 394/796

***Ляневіч Андрэй***
*Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск, Беларусь*

# СПРОБА СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАГА СПАРТЫЎНАГА АСЯРОДКУ Ў 20-30-Я ГАДЫ ХХ СТАГОДДЗЯ НА ТЭРЫТОРЫІ ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

У артыкуле разгледжана пытанне стварэння нацыянальных гімнастычных таварыстваў у канцы XIX пачатку XX стагоддзяў, а такса-

ма спробы арганізацыі беларускага спартыўнага руху ў міжваенны перыяд на тэрыторыі Польскай Рэспублікі.

***Ключавыя словы: спорт, спартыўныя таварыствы, гульні, Польская Рэспубліка, Гайсак, Вільня, Макабі, Сокал, скаўты***

Перыяд XIX – першай паловы XX стагоддзя адзначыўся многімі геапалітычнымі працэсамі, як у Заходняй, так і Усходняй Еўропе. Акрамя іншага, праходзіла фарміраванне асноў нацыянальнай ідэнтычнасці шэрагу народаў, які насялялі тэрыторыі еўрапейскіх дзяржаў, асабліва Аўстра-Венгерскай і Расійскай імперый, дзе насельніцтва пэўных рэгіёнаў пачынала атасаямляць сябе асбоным народам, нацыяй. Паралельна з этна-сацыяльнымі зменамі адбывалася паступовае зложванне еўрапейскага і сусветнага спартова-гімнастычнага руху, асабліва ў другой палове XIX стагоддзя, калі фізічнаму выхаванню сталі надаваць вялікую ўвагу як энтузіясты, шляхам стварэння гімнастычных аб'яднанняў, так і дзяржава, у форме заняткаў гімнастыкай у адукацыйным працэсе. Такім чынам, розныя слаі грамадства, асабліва моладзь, уключалася ў дзейнасць гімнастычных таварыстваў ці спартыўных секцый.

Дадзеная акалічнасць абумовіла тое, што ў разглядаемы перыяд абодва працэсы перыядычна былі цесна звязаныя між сабою, прыкладам могуць быць нямецкія землі сярэдзіны XIX стагоддзя, дзе педагог Фрыдрых Людвіг Ян (Friedrich Ludwig Jahn) заснаваў агульнанямецкі гімнастычны рух, спрабуючы нацыянальна арыентаваць яго дзейнасць. Моцны аб'яднаўчы фактар і неабходнасць фізічнага выхавання была заўважана і яўрэйскімі дзеячамі. Па ініцыятыве лекара, палітыка Макса Нардаў (Südfeld Maximilian Simon) у Берліне было створана першае яўрэйскае спартыўнае таварыства, а ўжо ў пачатку XX стагоддзя распаўсюджаным стаў так званы "Макабіянскі спартыўны рух", які меў мэтай прапаганду фізічнай культуры і сіяністкіх ідэй сярод яўрэяў [10, с. 133-135], [7, с. 692-693].

Важнасць фізічнага гартавання ў выхаванні нацыянальнай свядомасці была адзначана чэскім педагогам, доктарам філасофіі Міраславам Тыршам (Miroslav Tyrš). У 1862 годзе ім быў створаны першы спартыўны клуб, дзе злучаліся трэніроўкі і ідэалогія чэшскага нацыяналізма, пазней – панславізма [13, с. 21-39]. Ідэя сакольніцтва стала адной з самых папулярных фактычна на ўсіх землях, дзе пражывалі прадстаўнікі славянскага этнасу. У сваю чаргу, на тэрыторыі беларускіх земляў, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, вялі дзейнасць суполкі рускага і польскага "Сокалаў", а таксама разнастайныя

спартыўныя аб’яднанні у склад якіх, безумоўна, уваходзілі і беларусы, але фактычна да першай паловы ХХ стагоддзя актыўных спроб стварэння падобнай уласнай беларускай арганізацыі не вялося.

Па ўмовах Рыжскай мірнага дагавора 1921 года частка беларускіх земляў увайшла у склад Польскай Рэспублікі, як тэрыторыя Усходніх Крэсаў (Kresy Wschodnie), што мела ўплыў на далейшае грамадска-культуране развіццё рэгіёна і нацыянальнае самаўсведамленне яго насельнікаў [11, с. 225-230]. Шматнацыянальнасць польскай дзяржавы, дзе акрамя тытульнай нацыі, пражывалі немцы, беларусы, рускія, украінцы, яўрэі, а таксама прынящце Сеймам яшчэ 28 красавіка 1919 года, так званага “Трактата нацыянальных меншасцяў” (Traktat mniejszościowy), абумовіла ўдзел прадстаўнікоў вышэйадзначаных народаў у грамадска-палітычным, культурным і спартыўным жыцці краіны праз дзейнасць разнастаўных таварыстваў, саюзаў і арганізацый, дзе ішла патрыятычна-выхаваўчая праца і разам з тым стрымліваўся ўплыў паланізацыі з боку польскіх улад [8].

У сваю чаргу, на беларускім нацыянальным падмурку грунтаваўся шэраг грамадскіх аб’яднанняў, у асноўным асветніцкага накірунку. Адной з самых буйных арганізацый, створанай у ліпені 1921 года было “Таварыства беларускай школы”, што мусіла распаўсюджваць асвету сярод беларусаў, ствараць беларускія школы, праводзіць адпаведнае навучанне [9]. У навукова-асветніцкім рэчышчы дзейнічала і Беларускае навуковае таварыства, якое мела права ствараць, ўтрымліваць на свой кошт музеі, бібліятэкі, навуковыя ўстановы і г.д., у справе развіцця самасвядомасці дзейнічаў Беларускі студэнцкі саюз, які быў заснаваны студэнтамі, беларусамі Універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні і інш. [12, с. 457-459], [1, с. 5-6].

Разам з тым, моцным адукацыйна-выхаваўчым асяродкам была Віленская беларуская гімназія (далей – Гімназія), дзе існавалі ўласная бібліятэка, хор, разнастайныя вучнёўскія гурткі і г.д., менавіта дадзеная навучальная ўстанова стала асновай для спробы стварэння ўласнабеларускага гімнастычнага аб’яднання. Нягледзячы на культурніцкую дзейнасць вышэйзгаданых структур у грамадскім жыцці і галіне адукацыі пытання аб спартыўным руху фактычна не разглядалася, што можа быць абумоўлена не толькі слабым фінансава-эканамічным і адміністрацыйным рэсурсам, але і недастатковай нацыянальна-кансалідуючай сілай у грамадстве [2, с. 274-275].

Ініцыятарам і натхняльнікам беларускага спорту выступіў грамадска-палітычны дзеяч, паэт, публіцыст Уладзіслаў Казлоўскі, які цесна супрацоўнічаў з шэрагам нацыянальных арганізацый, у тым

ліку Беларускім нацыянальным камітэтам і Беларускім інстытутам гаспадаркі і культуры. Акрамя таго, ён стаў аўтарам некалькіх выданняў, сярод якіх – "Фізычнае выхаваньне грамадзянства" (1927 г.) і "Аб фізычным выхаваньні ў беларусаў" (1928 г.), у якіх непасрэдна вялася прапаганда фізічнай культуры, сувязь яе з беларускай традыцыяй, народнымі гульнямі і г.д., што магло стаць асновай для паўстання асяродку.

Адной з мэтаў было стварэнне арганізацыі падобнай да скаўцкай, якая б аб'ядноўвала ў першую чаргу моладзь, заахвочваючы яе да спорту, здаровага ладу жыцця, актыўнай грамадскай і культурніцкай дзейнасці. У выніку чаго, на базе Гімназіі напрыканцы 20-х гадоў пачаў дзейнічаць гурток "Гайсакі" (далей – гурток), які спрабаваў ахапіць большую частку навучэнцаў праз удзел у вандроўках, краязнаўчых, гімнастычных занятках і г.д. Таксама з ліку сябраў арганізацыі была ўтворана аднайменная футбольная каманда, якая ладзіла гульні з прадстаўнкамі іншых навучальных устаноў Вільні, з'яўляючыся фактычна першым выключна беларускім клубам [2, с. 274-275].

У красавіку 1930 года была спроба з боку стваральнікаў зарэгістраваць гурток, як асобную структуру з наданнем ёй юрыдычнага статусу, праз падачу дакументаў у Міністэрства ўнутраных спраў Польскай Рэспублікі, але польскія ўлады адмовілі ў рэгістрацыі Статуту Гімнастычна-спартыўнага таварыства "Гайсак", што практычна не дазваляла надалей афіцыйна развіваць спартыўных рух на беларускім ідэйным падмурку [3]. Нягледзячы на супрацiў з боку дзяржаўнай адміністрацыі і недахоп фінансавага рэсурсу, Уладзіславам Казлоўскім пастаянна вяліся захады па папулярызацыі ідэі нацыянальнага спорту. У адным з маладзёжных тагачасных выданняў "Шлях моладзі" перыядычна з'яўляліся тэматычныя артыкулы, дзе падрабязна апісваліся розныя гульні, друкаваліся спартыўныя навіны і зазначалася неабходнасць стварэння ўласнай арганізацыі: "… сам спорт ёсьць вельмі патрэбны і пажаданы для ўсіх, а ў гэтым ліку і для нас беларусаў. А знача спорт, так як і асвету, беларусам трэба пашыраць саматужна, шляхам прыватнай групавой працы" [6].

Чарговая спроба зарганізаваць беларускую моладзь на глебе фізічнага развіцця адбылася ў 1935 годзе, калі з ініцыятывы навучэнцаў Гімназіі была закладзена скаўцкая суполка, якая па дамоўленасці з Польскім харцэрскім саюзам увайшла ў склад Віленскай харугвы як 10-я Дружына беларускіх скаўтаў імя Францішка Багушэвіча (далей - Дружына). Гэта дало мажлівасць у наступныя гады праводзіць уласныя мерапрыемствы, а таксама сумесна з польскім бокам выступаць

на агульнаскаўцкіх злётах і спаборніцтвах у Польшчы і па-за межамі краіны, удзельнічаць у адукацыйных курсах. Варта адзначыць, што ў 1936 годзе пры Дружыне з'явілася і першая жаночае аддзяленне [4], [5].

Такім чынам, на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, нягледзячы на грамадска-сацыяльны і эканамічныя фактары, а таксама супрацьдзеянне польскіх улад, адбывалася спроба стварэння ўласнабеларускага спартыўнага асяродку, які б даў мажлівасць прапагандаваць і развіваць фізічную культуру сярод беларусаў, асабліва моладзі, на нацыянальным падмурку, на прыкладзе падобных польскіх, украінскіх, яўрэйскіх і іншых арганізацый.


1. Гадавік Беларускага навуковага таварыства ў Вільні / пад. рэд. А. Луцкевіча. – Вільня : Друкарня Я. Левіна, 1933. – 212 с.
2. Ляхоўскі, У. В. Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёжных арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1-й палове XX ст. (да 1939 г.) / У. В. Ляхоўскі. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 480 с.: іл.
3. «Не зьмяніліся» : [Аб дзейнасці беларускіх арганізацый у Польскай Рэспубліцы] / Казлоўшчык // Наш шлях. – 1934. – 25 мая – С. 5-6.
4. «У беларускіх скаўтаў» : [Аб стварэнні і дзейнасці беларускай скаўцкай арганізацыі] / ад карэспандэнта J. N. // Шлях моладзі. – 1935. – ліст. – С. 11.
5. «У беларускіх скаўтаў» : [Аб дзейнасці беларускай скаўцкай арганізацыі] / ад уласнага карэспандэнта // Шлях моладзі. – 1936. – май – С. 17.
6. «Ці патрэбны спорт на вёсцы?» : [Аб стварэнні сбеларускіх спартыўных арганізацый] / ад уласнага карэспандэнта // Шлях моладзі. – 1937. – чэрв. – С. 9.
7. Энциклопедический словарь Брокгауза и Ефрона: в 82 т. (1890 – 1907) / под ред. И. Е. Андреевского. – СПб.: Акционерное общество Брокгауз-Ефрон, 1904. – T. XLIA. – 956 с.
8. Balcerak, W. Mniejszości – rewizjonizm / W. Balcerak // Mazowieckie Studia Humanistyczne / red.: A. Koryn. – Łowicz : 2008. – № 1-2. – С. 75 – 91.
9. Gomółka, K. Białoruskie instytucje kulturalno-oświatowe w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne / red.: E. Mironowicz. – Białystok : 1998. – № 9. – S. 140 – 148.
10. Nordau M. Zionistische Schriften. Hrgs. Vom Zionistischen Aktionskomitee. – Köln : Jüdischer Verlag, 1909. – 434 s.
11. Polski wiek XX. Tom I / red.: K. Persak [I in.]. – Warszawa : Bellona. – 2009. – 331 s.
12. Tomaszewski, P. Polskie korporacje akademickie w latach 1918–1939 / P. Tomaszewski. – Toruń : Wydawca Cycero.pl, 2011. – 516 s.
13. Tyrš M. Úvahy a řeči o věci sokolské. Praga : Slavnostní výbor 1. sletu slovanského sokolstva, 1912. – 130 s.


## AN ATTEMPT TO CREATE A BELARUSIAN SPORTS ORGANIZATION IN THE 20-30S OF THE XX CENTURY ON THE TERRITORY OF THE POLISH REPUBLIC

***Andry Lianevich***
*National Institute for Higher Education, Minsk, Belarus, andrislatva@inbox.lv*

The article examines the establishment of national gymnastic societies in the late XIX and early XX centuries, as well as attempts to organize the Belarusian sports movement in the interwar period in the Republic of Poland.

***Keywords: sports, sports clubs, games, Republic of Poland, Hajsak, Vilno, Maccabi, Sokol, scouts.***